Агнешка Рамашэўская-Гузы
Дырэктарка “Белсат”

Копія:
Беларуская асацыяцыя журналістаў

11 чэрвеня 2018 г.

**Шаноўныя спадарыня Рамашэўская-Гузы!**

23-25 траўня 2018 г. адбыўся першы Форум “Мінскага дыялогу”, які сабраў у беларускай сталіцы каля 500 удзельнікаў з 59 краін. Сярод іх – вядучыя аналітычныя цэнтры і акадэмічныя ўстановы з краін ЕС, Расіі, ЗША, краін “Усходняга партнёрства”, Кітаю і іншых краін. Таксама спікерамі форума з’яўляліся прадстаўнікі шэрагу міжнародных інстытуцый: Савета Еўропы, Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў, НАТА, АДКБ і Рады краін балтыйскага мора.

Арганізатарам форума з’яўляецца экспертная ініцыятыва “Мінскі дыялог”. Партнёрамі форума выступілі 12 арганізацый і кампаній, інфармацыйнымі партнёрамі – 5 беларускіх і замежных СМІ. З поўным спісам партнёраў форума, а таксама яго канцэпцыяй і праграмай можна азнаёміцца на старонцы “Мінскага дыялогу” – http://minskdialogue.by/en/forum

Напярэдадні форума мы накіравалі на адрас рэдакцыі “Белсат” ліст, у якім дазволілі акрэдытаваць журналістаў вашага тэлеканала для працы на форуме (акрамя выязной сесіі 24 траўня ў адміністратыўным комплексе “БелЭкспа”, акрэдытацыяй на якую займалася прэс-служба прэзідэнта Беларусі). Пры гэтым у згаданым лісце мы выказалі занепакоенасць папярэднімі выпадкамі непрафесіяналізму і несумленнай працы з боку “Белсат” пры асвятленні дзейнасці экспертнай ініцыятывы “Мінскі дыялог”. Мы таксама падкрэслілі, што па выніках працы тэлеканала на форуме намі будзе прынятае рашэнне наконт далейшай супрацы з “Белсат”.

Па стане на 11 чэрвеня на тэлеканале выйшла больш за 10 матэрыялаў, якія асвятлялі працу форума ці выкарыстоўвалі запісаныя на форуме інтэрв’ю з яго ўдзельнікамі. Прытым некаторыя з гэтых матэрыялаў не даюць спасылкі на форум. Напрыклад, у праграме “Прасвет” ад 2 чэрвеня было паказана вялікае інтэрв’ю з удзельнікам Форума “Мінскага дыялогу” з

Арменіі Аляксандрам Іскандаранам без узгадвання самога форума (http://belsat.eu/news/chamu-belarus-pradae-zbroyu-azerbajdzhanu-voragu-armenii/).

Агулам пры азнаямленні з прысвечанымі форуму матэрыяламі “Белсат” цяжка не заўважыць тэндэнцыёзнасць рэдакцыйнай палітыкі. Напрыклад, ужо ў першы дзень форума выйшаў “Гарачы каментар” з месца правядзення форума пад назвай “На Менскім дыялогу няма дыялогу” (http://belsat.eu/programs/na-menskim-dyyalogu-nyama-dyyalogu/), падчас якога вядучы Валер Руселік і акрэдытаваная на форуме журналістка Кацярына Андрэева дазволілі сабе шэраг зняважлівых заяваў на адрас “Мінскага дыялогу”. Больш за тое, у іх словах змяшчалась заведамая хлусня.

Так, яны некалькі разоў казалі, што сярод удзельнікаў форума няма прадстаўнікоў незалежнага грамадства і лідараў грамадскай думкі. На самой справе ў форуме ўдзельнічала вялікая колькасць незалежных беларускіх экспертаў і шэраг экспертаў, якія з’яўляюцца сябрамі апазіцыйных палітычных партый. Ня ведаць гэтага прадстаўнікі “Белсат” не маглі.

Такая ж дэзінфармацыя змяшчалась ў словах вядучага Велера Руселіка падчас “Гарачага каментара” увечары 24 траўня (http://belsat.eu/programs/klaskouski-paslya-krymu-kiraunitstva-belarusi-natapyrylasya/). Вядучы падкрэсліў, што на форум не дапусцілі лідараў грамадскай думкі. І гэта пры тым, што на злучэнні з ім з пляцоўкі форума (і з бэйджам удзельніка форума) быў адзін з самых яскравых прадстаўнікоў незалежнай грамадскай думкі Аляксандр Класкоўскі, а на кадрах з форума былі добра бачныя шматлікія іншыя незалежныя беларускія эксперты.

Больш за тое, падчас гэтага эфіру вядучы заявіў, што арганізатары стварылі “пэўныя абмежаванні ў працы для нашых калегаў”. Гэта яшчэ адзін прыклад няпраўдзівай інфармацыі. Арганізатары прыклалі ўсе намаганні, каб журналісты “Белсат” маглі паўнавартасна працаваць у гатэлі “Marriott”, у тым ліку дапамагалі ім з арганізацыяй запісу інтэрв’ю з экспертамі, а таксама запрашалі нараўне з усімі ўдзельнікмі на кава-паўзы, абеды і прыёмы. Паказальна і тое, што журналісты “Белсат” былі першымі, хто пачаў працаваць на форуме яшчэ да яго адкрыцця, і апошнімі з журналістаў, хто яго пакінуў.

На вялікі жаль, такога кшталту сюжэты сведчаць не толькі пра непрафесіяналізм асобных журналістаў, парушэнне базавых прынцыпаў журналісцкай этыкі, але і пра мэтанакіраваную дэскрыдытацыю дзейнасці “Мінскага дыялогу”. Вельмі сумна, што тэлеканал, які дэкларуе місію барацьбы з інфармацыйнымі фэйкамі, прапагандай і дэзінфармацыяй, сам дэманструе найгоршы варыянт прапаганды, “чорнага піяру” і проста непрафесіяналізму.

Гэтым разам перадузятае стаўленне з боку журналістаў “Белсат”, на наш погляд, перакрочыла ўсе магчымыя межы. Дзеля абароны рэпутацыі самога “Мінскага дыялогу”, а таксама шматлікіх беларускіх і замежных партнёраў

форума і амаль 500 удзельнікаў, арганізатары вымушаны рэагаваць адпаведным чынам.

Мы пакідаем спадзеў, што ўзгаданыя і іншыя матэрыялы адлюстроўваюць непрафесіяналізм і тэндэнцыёзнасць асобных журналістаў і рэдактараў "Белсат", але не пазіцыю кіраўніцтва тэлеканала. Таму мы звяртаемся да Вас з прапановай зрабіць афіцыйную заяву з прабачэннямі на адрас арганізатараў і партнёраў Форума "Мінскага дыялогу" за неаб'ектыўнае і несумленнае асвятленне мерапрыемста.

Калі да 25 чэрвеня 2018 г. у эфіры і на сайце тэлеканала "Белсат" такая заява не будзе зроблена, мы будзем лічыць, што кіраўніцтва тэлеканала афіцыйна падпісваецца пад усімі словамі сваіх журналістаў.

У такім выпадку "Мінскі дыялог" са свайго боку будзе вымушаны цалкам спыніць любую супрацу з тэлеканалам "Белсат", а журналісты тэлеканала больш не атрымаюць акрэдытацыю ні на адно наша мерапрыемства.

*З павагай,*



**Яўген Прэйгерман**

Кіраўнік экспертнай ініцыятывы "Мінскі дыялог"